***Наталля Карчэўская***

## УПЛЫЎ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ НА МАСТАЦКІ СІНТЭЗ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ І ЗАМЕЖНЫХ ТРАДЫЦЫЙ Ў ХАРЭАГРАФІЧНЫХ ТВОРАХ: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

Найбольш актуальнымі праблемамі сучаснасці з'яўляецца страта культурных нацыянальных традыцый і гістарычных каранёў, уніфікацыя культурных нормаў і светапогляду ва ўмовах глабалізацыі. Менавіта высокі ўзровень развіцця сродкаў масавай камунікацыі і інфармацыі абумовіў фарміраванне асноўных рыс масавай культуры грамадства, якія выяўляюцца, перш за ўсё, у арыентацыі на спажыванне. Аднак нельга адмаўляць і таго, что сёння найбольш значнымі з'яўляюцца тэндэнцыі да захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Праблемы захавання і актуалізацыі культурнай спадчыны розных народаў можна аднесці да ліку найбольш складаных праблем сучаснай культуры, у вырашэнні якіх трэба пераадолець існуючы разрыў паміж тэорыяй і практыкай культуратворчай дзейнасці.

Танец, з аднаго боку, можна аднесці да найбольш запатрабаваных у сучасным грамадстве мастацкіх жанраў і, адначасова, да неад'емных кампанентаў побыту, у прыватнасці, маладзёжнага; з іншага боку, узровень тэарэтычнага асэнсавання танцавальна-пластычнай культуры, відавочна не адпавядае яе рэальнаму статусу ў грамадстве. Сучасныя СМІ маюць магутны патэнцыял не толькі ў рэпрэзентацыі каштоўнасцей традыцыйнай мастацкай культуры, але і ў трансфармацыі якасных характарыстык асобных відаў мастацтва.

Танцавальна-пластычнае мастацтва адрозніваецца асобай дынамічнасцю, здольнасцю да зменаў. Сёння гэта сфера ўяўляе сабой складаны кангламерат традыцыйнага і новага, спрадвечнага і запазычанага. Дадзенная сітуацыя звязана, перш за ўсё, з асаблівасцямі самого харэаграфічнага матэрыяла: са спосабам яго існавання і передачы ў «вуснай» традыцыі і, адпаведна, з адсутнасцю строгай фіксацыі; высокай варыятыўнасцю ў выкананні і вялікай роляй імправізацыйнага пачатку; рознай ступенню захаванасці ў розных народаў. Такія віды сучасных сродкаў масавай інфармацыі, як тэлебачанне і інтэрнет выступают не толькі ў якасці рэтранслятараў, але і фіксатараў, захавацеляў харэаграфічных твораў.

Танец заўсёды не проста займаў вызначанае месца ў сацыякультурнай рэальнасці, але і адлюстроўваў у сабе ўсю культуру таго ці іншага гістарычнага часу ў яе цэласнасці, што на наш погляд, з'яўляецца важным фактарам для даследавання дынамічных працэсаў у танцавальнай культуры ўвогуле, і ў народнай харэаграфіі ў прыватнасці. Узмацненне цікавасці да дынамікі народнага танца, да ўмоў з'яўлення ў ім навацый, да прычын змянення традыцыйных танцавальных формаў, элементаў, абумоўлена, перш за ўсё, тым, што функцыянаванне СМІ значна павысіла хуткасць гэтых змяненняў у параўнанні з папярэднімі перыядамі развіцця народнай танцавальнай культуры. У дадзены час дастаткова відавочным становіцца тое, што сучасная харэаграфічная культура не можа быть зведзена толькі да яе традыцыйных кампанентаў. Патрэбен гарманічны, узважаны падыход да вывучэння праблемы суадносін у культуры традыцый і інавацый [1, с. 186].

Неабходна вызначыць сутнастныя характарыстыкі народнага танца, якія адрозніваюць яго ад іншых відаў танцавальнай творчасці. З нашага пункту гледжання, народны танец – гэта танец, заснаваны на этнапластычных канстантах, якія сфарміраваліся на самых ранніх этапах зараджэння этнаса ці этнасаў, з якіх потым узнікла пэўная нацыя ў працэссе адаптацыі да прыродных і сацыяльных умоў. Гэтыя канстанты складаюць інварыянтную аснову танцавальных традыцый таго ці іншага народа. У рамках канкрэтнай культурнай парадыгмы, якая, аб'ектывіруе вядучыя сэнсы эпохі, задае вызначаныя прадпісанні для разнастайных сфер дзейнасці, у тым ліку і танцавальнай, менавіта на аснове сваіх этнапластычных канстант народныя танцавальныя традыцыі крышталізуюцца, напаўняюцца канкрэтным зместам, які адпавядае каштоўнасным арыентацыям народа як суб'екта пэўнай культурнай парадыгмы.

Такім чынам, у даследванні народнай танцавальнай культуры трэба акцэнтаваць значнасць этнанацыянальнай спецыфікі танцавальнай творчасці пэўнага народа. Этнанацыянальная спецыфіка фарміруецца пад уплывам базісных фактараў (прыродна-ландшафтных, гаспадарчых, сацыяльна-арганізацыйных), якія дазваляюць трактаваць мастацка-эстэтычныя асаблівасці таго ці іншага народа як вытворную ад яго сацыякультурнай жыццядзейнасці ў межах пэўнай культурнай парадыгмы. Таму нацыянальныя танцавальныя формы, нацыянальная танцавальная мова, нацыянальнае танцавальнае мысленне і ўспрыманне ўяўляюць сабой больш устойлівыя ўтварэнні, чым, напрыклад, з'явы масавай танцавальный культуры, якія ў большасці сваёй вельмі скарацечныя і хутка забываюцца. Аднак СМІ пастаянна «падкідваюць» новыя ўзоры масавай танцавальнай культуры, што не можа не прыводзіць да пранікнення харэапластычных элементаў, папулярных на дадзенны момант нават у структуру танцаў фальклорных.

На працягу XX стагоддзя танец прайшоў шлях ад народна-бытавога танца да танца стылізаванага народна-сцэнічнага. Пры гэтым змены, якія тычыліся народнай харэаграфіі ў гэты перыяд, былі вельмі істотнымі і адбываліся даволі імкліва. Тэлебачанне, як найбольш аўтарытэтны від СМІ актыўна спрыяла таму, что адным з асноўных прынцыпаў развіцця танцавальнага мастацтва у XX – пачатку XXI стагоддзя з'яўляецца прынцып яго прафесіяналізацыі. Уздымая на больш высокі ўзровень выканальніцкае майстэрства народных танцаў, гэты працэс спрыяў яшчэ і таму, что паступова змяніўся носьбіт нацыянальных традыцый ад простага народа да прафесійных выканаўцаў, балетмайстраў і педагогаў, што непасрэдна адбілася і на

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

развіцці айчыннай бытавой харэаграфіі. Развіццё сродкаў масавай інфармацыі, сувязі, масавай камунікацыі, даступнасць разнастайных звестак аб народных танцавальных культурах папярэдніх парадыгм прывялі да таго, што сучасная танцавальная культура сумяшчае ў сабе іх мастацкія дамінатары як раўнапраўныя і ўспрымае як суіснуючыя з ёй у адзінай часавай прасторы.

З сярэдзіны XX стагоддзя зніклі апошнія тэхнічныя перашкоды да пранікнення разнастайных відаў танцавальнага мастацтва іншых народаў у культурную прастору любой краіны, любога кантынента на зямным шары. Адсутнасць прасторава-тэхнічных бар'ераў у абмене харэаграфічнай інфармацыяй паміж культурамі розных нацый нярэдка прыводзіць да дыфузіі, запазычванню гатовых формаў, да сінтэзу розных стыляў і кірункаў у адным танцавальным творы. Такая прасякнутасць сучаснай культуры разнастайнымі сінхроннымі і дыяхроннымі ўзаемадзеяннямі робіць цалкам натуральным тое, што у адным харэаграфічным творы могуць сінтэзіравацца беларускія тэматычныя матывы і танцавальная лексіка з «іна-фальклорным» лексічным модулем (напрыклад, з рухамі джазавага танца і танца бута, якія абапіраюцца, адпаведна, на афрыканскі і японскі фальклор). Аднак, не адмаўляючы плённасць сінтэзу такога кшалту для развіцця харэаграфічнага мастацтва, нельга, тым не менш, не усведамляць сур'ёзную небяспеку нівеліравання асабістай нацыянальнай «харэаграфічнай ідэнтычнасці». Сярод харэаграфічных твораў, якія транслíруюць сродкі массавай інфармацыі, пераважную большасць складаюць узоры не беларускага фальклору, таму танцавальныя традыцыі іншых народаў успрымаюцца рэцыпіентамі як больш мастацка-каштоўныя і значныя. У штодзённай творчай практыцы гэта прыводзіць да таго, што і ў самом харэаграфічным асяродзі, у балетмайстраў і выканаўцаў, памяншаецца цікавасць да беларускага харэаграфічнага фальклору. Асабліва яскрава гэта тэндэнцыя выяўляецца ў эстрадным танцы. На беларускай эстрадзе мы бачым велізарную колькасць харэаграфічных нумароў, увасабляючых «іна-фальклорныя» традыцыі. Гэта нумары, якія пастаўлены «па матывах» іспанскага, цыганскага, арабскага, ірландскага і т.п. танцаў.

Як нам падаецца, для далейшых навуковых даследаванняў перспектыўным з'яўляецца вывучэнне наступных пытанняў: ці аднолькава схільны да ўплыву чужых культур танцавальныя сістэмы розных народаў; ад якіх фактараў залежыць ступень гэтага ўплыву; якія магчымыя вынікі абмена харэаграфічнай інфармацыяй, ці якая магчымасць уніфікацыі культурных нормаў і узораў у танцавальных культурах розных нацый ва ўмовах свету, які ўвесь час зменьваецца.

**Спіс літаратуры:**

1. Чурко, Ю.М. Линия, уходящая в бесконечность / Ю.М. Чурко. – Минск : Полымя, 1999. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ